З пункту гледжання станаўлення фундаментальных культуралагічных ведаў катэгорыя традыцыі, якая злучае ў сабе элементы культурнай спадчыны і формы яе ацэнкі, дазваляе праецыраваць тэарэтычныя палажэнні на культуратворчую практыку.


1. *Касавин И.Т.* Традиции и интерпретации: фрагменты исторической эпистемологии. – М.; СПб.: РХГИ, 2000. – 320 с.

2. *Плахов В.Д.* Традиции и общество: опыт философско-социологического исследования. – М.: Мысль, 1982. – 220 с.

3. *Шепель В.М.* Традиции как объект и средство социального управления // Социальное познание и управление / под ред. С.И. Попова, Б.И. Сюсюкалова. – М.: Мысль, 1983. – 288 с.


**С.В.Зыгмантовіч,** *дацэнт*

## РОЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ КАФЕДРЫ Ў ГРАМАДЗЯНСКІМ ВЫХАВАННІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ

Фарміраванне сацыяльна сталай, актыўнай асобы прадугледжвае яе інтэлектуальнае і духоўнае развіццё, якое ў значнай ступені павінна забяспечыць сучасная сістэма адукацыі.

Грамадзянскае выхаване – гэта фарміраванне грамадзянскасці як інтэгратыўнай якасці асобы, якая дазваляе чалавеку адчуваць сябе юрыдычна, сацыяльна, маральна і палітычна дзеяздольным. Асноўная мэта грамадзянскага выхавання – выхаванне ў чалавека маральных ідэалаў грамадства, пачуцця любові да Радзімы, імкнення да міру, патрэбнасці ў працы на карысць грамадства. Свядомасць чалавека, які з адказнасцю выконвае свой грамадзянскі абавязак і разумее, што ад яго дзеянняў залежаць не толькі ўласнае жыццё, але і лёс блізкіх людзей, народа і дзяржавы, вызначае яго сацыяльныя

паводзіны і з'яўляецца умовай развіцця дэмакратычнага грамадства [1, 2].

Выхаваўчая работа са студэнцкай моладдзю мае асаблівую значнасць, патрабуе навуковага падыходу, уліку сацыякультурных асаблівасцей гэтай катэгорыі. Бясспрэчна, што сацыякультурныя рысы студэнцкай моладзі і яе сацыяльная, грамадзянская пазіцыя маюць важнае значэнне як для агульнай ідэйна-маральнай атмасферы ў грамадстве, так і для практычнага вызначэння шляхоў развіцця краіны. Безумоўна, для фарміравання якасна новага грамадства патрабуецца высокі ўзровень агульнакультурнага, грамадзянскага развіцця студэнцкай моладзі, паколькі ў бліжэйшым будучым яна будзе складаць інтэлектуальную эліту краіны. Падрыхтоўка ж будучых бібліятэкараў – гэта падрыхтоўка менавіта тых спецыялістаў, якія павінны выступаць суб'ектамі выхаваўчага працэсу.

Выхаванне грамадзянскасці асобы вызначаецца не толькі суб'ектыўнымі намаганнямі выхавацелей, але перш-наперш аб'ектыўным станам грамадства, узроўнем развіцця дэмакратыі, гуманнасці [3].

Трэба ўлічваць, што асновы грамадзянскасці асобы закладваюцца ў дзіцячым, затым падлеткавым, юнацкім узросце на падставе вопыту, набытага ў сям'і, школе, сацыяльным асяроддзі. Сучасныя студэнты фарміраваліся ў постперабудовачны перыяд, калі ў краіне адбываліся значныя перамены ў эканамічным і духоўным жыцці, складваліся асновы развіцця краіны як самастойнай дзяржавы. Гэта не магло не паўплываць на ўяўленні моладзі аб жыццёвых каштоўнасцях, іх асабістыя якасці. Студэнцкая моладзь валодае высокай ступенню сацыяльнай адаптыўнасці і мабільнасці. У сувязі з гэтым студэнты больш чула, чым іншыя сацыяльна-дэмаграфічныя групы, рэагуюць на ўплыў знешніх фактараў [4].

Адзначанае трэба ўлічваць і кожнаму выкладчыку спецыяльнай кафедры. Гэта кафедра арганізуе сваю работу як адзін з суб'ектаў ва універсітэце, і яе ўклад у грамадзянскае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

станаўленне студэнцкай моладзі вызначаецца зместам выкладаемых дысцыплін, метадамі і формамі работы, рознаўзроўневым уплывам на групы пэўных спецыялізацый.

Універсітэт – гэта не толькі сацыяльны інстытут падрыхтоўкі чалавека да працы, але і важнейшая сацыяльна-культурная сістэма, якая забяспечвае асобе магчымасць усебаковага развіцця. Чым гарманічней будзе агульнакультурнае, сацыяльна-маральнае і прафесійнае развіццё асобы, тым больш свабодным і творчым становіцца чалавек у сваёй дзейнасці, тым больш ствараюцца ўмовы для асэнсаванай прыхільнасці, імкнення да захавання культурнай спадчыны, нацыянальных каштоўнасцей, міжнацыянальных і міжасобасных адносін. Гэта ў сваю чаргу садзейнічае развіццю ў моладзі самасвядомасці, а без яе, як вядома, не можа быць дзяржавы, нацыі.

Агульная мэта гуманістычнага выхавання ў ВНУ канкрэтызуецца, удакладняецца ў выглядзе адэкватных ёй задач, якія вырашаюцца ў працэсе засваення студэнтамі сацыягуманітарных і культуралагічных вучэбных курсаў: фарміраванне ў свядомасці студэнтаў навуковай карціны свету; філасофска-светапоглядная арыентацыя студэнтаў у разуменні сэнсу жыцця, сваёй унікальнасці і каштоўнасці; далучэнне да сістэмы культурных каштоўнасцей, што акумулююць багацце агульначалавечай і нацыянальнай культуры, фарміраванне асабістых адносін да іх; засваенне агульначалавечых нормаў гуманізму (справядлівасці, дабра, прыгажосці, узаемаразумення, спачування, міласэрнасці і інш.), кіраванне імі ў жыцці і культываванне інтэлігентнасці як важнай асобаснай якасці; выхаванне патрыятызму ў адзінстве этычных і эстэтычных каштоўнасцей, павагі да законаў краіны і грамадзянскіх правоў асобы.

Прэрагатывай пераважна спецыяльных дысцыплін з'яўляецца задача "дапамагчы навучыцца рабіць", сфарміраваць кампетэнтнасць у сферы працоўнай дзейнасці. Між тым у працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін рэалізуецца і працэс выхавання, у тым ліку і фарміраванне кампетэнтнасці ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сферы грамадскай дзейнасці, фарміраванне студэнта як грамадзяніна.

На выхаванне грамадзянскіх якасцей асобы студэнта накіраваны і новыя канцэптуальныя падыходы да выкладання спецыяльных дысцыплін: развіваючы падыход, спалучэнне ў працэсе навучання прынцыпаў калектывізму і індывідуальнага развіцця асобы; узмацненне гуманітарнай накіраванасці вучэбных дысцыплін, уключэнне у традыцыйныя вучэбныя курсы чалавеказнаўчага матэрыялу, які дапамагае студэнтам зразумець сябе і іншых, сфарміраваць адносіны да навакольнага свету, сваёй будучай прафесійнай дзейнасці; навучанне шляхам аналізу канкрэтных вытворчых сітуацый, дзелавых гульняў, свабодных дыскусій, абмеркавання; вызваленне студэнта ў вучэбным працэсе ад страху перад памылкай; стварэнне праблемных сітуацый, што стымулююць свабодны выбар рашэнняў і рэалізуюць творчы патэнцыял асобы і інш.

Адзін з асноўных кірункаў работы па грамадзянскім выхаванні – фарміраванне вопыту грамадзянскіх дзеянняў, што дапамагае студэнтам практычна рэалізаваць важнейшыя чалавечыя каштоўнасці, якія ляжаць у аснове іх светапогляду, выбіраць лінію паводзін, выяўляць адносіны да грамадства і саміх сябе. Выкладанне некаторых спецыяльных дысцыплін, такіх як “Абслугоўванне карыстальнікаў”, “Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы”, “Практыкум па навукова-метадычнай рабоце”, даюць магчымасць не толькі падрыхтаваць студэнта да практычнага авалодання пэўнымі формамі бібліятэчна-бібліяграфічнай работы, але і ўбачыць узровень сфарміраванасці студэнтаў, мэтанакіравана развіваць іх пэўныя светапоглядныя пазіцыі. У гэтым выпадку асабліва важнымі з’яўляюцца дыялогавыя формы, калектыўныя мерапрыемствы, прычым такія, якія накіраваны на падрыхтоўку не толькі ўнутрыгрупавых мерапрыемстваў, але і мерапрыемстваў факультэцкага і універсітэцкага ўзроўняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крыніцай сацыяльнага вопыту з'яўляецца праца, менавіта ў працы праяўляецца і ўзровень грамадзянскасці спецыяліста. У час вучобы фарміруецца прафесійная накіраванасць студэнта, закладваюцца асновы адносін да канкрэтнай прафесійнай дзейнасці. Арыентаванасць студэнтаў на гуманістычную накіраванасць будучай дзейнасці, сумленныя адносіны да выканання сваіх прафесійных абавязкаў, уменне працаваць у калектыве, з павагай адносіцца да карыстальнікаў бібліятэкі – усё гэта закладваецца ў працэсе выкладання спецыяльных дысцыплін. Мы павінны зрабіць усё магчымае, каб студэнт зразумеў, што высокапрафесійнае выкананне сваіх службовых абавязкаў – гэта ў першую чаргу яго грамадзянскі абавязак.

Менавіта комплекснае спалучэнне мэт, задач, зместу выкладання як сацыягуманітарных, так і спецыяльных дысцыплін дае магчымасць закладваць асновы для падрыхтоўкі не толькі грамадзяніна нашай краіны, але і падрыхтоўкі будучага бібліятэкара як спецыяліста, што будзе працаваць у дэмакратычным грамадстве і вырашаць адукацыйныя, выхаваўчыя, ідэалагічныя задачы ў сценах бібліятэкі падчас працоўнай дзейнасці.

Вопыт сацыяльнай работы набываецца студэнтамі і ў пазавучэбнай дзейнасці. Тут задача спецыяльнай кафедры – аказаць падтрымку актывістам групы, зрабіць усё, каб яны адчувалі падтрымку і ацэнку сваёй грамадскай дзейнасці з боку выкладчыкаў. Асобая роля ў гэтай рабоце адводзіцца куратарам. Менавіта куратар мае магчымасць (у параўнанні з выкладчыкам спецыяльных дысцыплін) скласці больш поўнае ўяўленне аб студэнце як асобе, аб яго грамадзянскіх якасцях, адносінах у калектыве. Куратар павінен валодаць методыкай фарміравання ў студэнтаў грамадзянскай матывацыі, валодаць сродкамі, якія б дапамагалі студэнтам самім ставіць перад сабой, студэнцкім калектывам грамадска значныя задачы і дасягаць іх выканання (спалучэнне грамадзянскіх ведаў і дзеянняў), вучылі студэнцкаму самакіраванню, выхоўвалі асоб,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія могуць працаваць ва ўмовах свабоды і адказнасці. Прычым гэтая работа павінна грунтавацца не на аўтарытарызме куратара, а на яго сацыяльна-педагагічнай, ідэалагічнай падрыхтаванасці, зацікаўленасці ў лёсе кожнага студэнта групы.

Разам з тым нельга не адзначыць і тыя супярэчнасці, з якімі сутыкаюцца выкладчыкі спецыяльных кафедраў пры арганізацыі выхаваўчай работы. Гэта супярэчнасці паміж:

– неабходнасцю фарміравання асобы студэнта, яго светапогляду, маральных якасцей і каштоўнасных арыентацый і размытасцю нормаў, каштоўнасцей і ідэалаў, характэрных для сучаснага грамадства;

– рознымі патрабаваннямі (часта супрацьлеглымі), прад'яўляемымі студэнтам ВНУ сям'ёй, юнацкай субкультурай, сродкамі масавай інфармацыі, г.зн. паміж накіраванай і стыхійнай сацыялізацыяй;

– высокімі маральнымі нормамі, якія культывуюцца ў ВНУ на тэарэтычным узроўні, і адхіленнямі ад іх у рэальным жыцці;

– наяўнасцю ў кожнага выкладчыка ўласнага светапогляду і неабходнасцю зыходзіць са шматлікасці тэорый, канцэпцый, якія могуць ў роўнай меры прэтэндаваць на сапраўднасць;

– канкрэтным характарам многіх вучэбных дысцыплін, што павінны сфарміраваць у студэнта пэўныя веды, навыкі, і неабходнасцю ўплываць на фарміраванне яго светапогляду і асобы цалкам;

– высокімі выхаваўчымі задачамі, якія стаяць перад выкладчыкамі, і часам нізкім узроўнем псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі некаторых з іх;

– значнасцю для многіх студэнтаў дыплома і нежаданнем пэўнай часткі з іх ўдасканальваць сябе ў асабістым і прафесійным плане;

– фармальнай прэстыжнасцю вышэйшай адукацыі ў грамадстве і фактычным узроўнем матэрыяльнай, сацыяльнай абароненасці бібліятэкараў – спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На вырашэнне адзначаных супярэчнасцей накіраваны выхаваўчы працэс у ВНУ. Каб ён быў больш эфектыўным, мэтазгодна наяўнасць наступных умоў:

– любой вучэбнай дзейнасці павінна папярэднічаць асэнсаваная пастаноўка выкладчыкам выхаваўчай мэты вучэбнага курса цалкам, асобнай лекцыі ці семінара, усіх іншых відаў і формаў заняткаў;

– змена з вузкаролевага падыходу выкладчыка (як носьбіта і транслятара ведаў у пэўнай галіне) на сістэмна-ролевы падыход да выхавання студэнтаў, фарміравання прафесійнага мыслення, калі выкладчык асэнсоўвае і эфектыўна выкарыстоўвае свой уплыў на асобу маладога чалавека;

– арыентацыя на кодэкс прафесійнай этыкі пры падрыхтоўцы будучых бібліятэкараў, якія дазволяць студэнтам асэнсаваць не толькі функцыянальную, але і маральную складаючую прафесійнай дзейнасці;

– узмацненне зваротнай сувязі студэнтаў з выпускнікамі ВНУ;

– пашырэнне сістэмы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў, стымуляванне іх прафесійнага росту не толькі ў якасці спецыялістаў у сваёй галіне, але і як кампетэнтных педагогаў, якія на высокім узроўні валодаюць псіхолага-педагагічнымі ведамі і навыкамі.

Такім чынам, дасягненне галоўнай мэты вышэйшай адукацыі – фарміраванне прафесіянала і грамадзяніна – павінна вырашацца сістэмна, комплексна, усімі сродкамі універсітэцкага асяроддзя, вучэбнай, выхаваўчай дзейнасці. Значная роля ў гэтым працэсе належыць спецыяльным кафедрам універсітэта.

---

1. *Канцэпцыя* выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь // Пазашкольнае выхаванне. – 2000. – №4. – С.10–19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Праграма* выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. Зацверджана Міністэрствам адукацыі Рэсп. Беларусь / [аўт.: А.А.Аладзін, К.У.Гаўрылавец, Н.В.Іванова і інш.]; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мн., 2001. – 120 с.

3. *Рудник Е.П., Кузьменкова Е.В.* Воспитание у студентов гражданской активности // Вышэйшая школа. – 2004. – №5. – С.57–58.

4. *Фаустова Э.Н.* Студент нового времени: социокультурный профиль. – М., 2004. – 72 с. – (Система воспитания в высшей школе: аналитические обзоры по основным направлениям развития высшего образования / НИИ ВО; вып.4).

**П.Г.Игнатович,** *профессор*

## ИДЕОЛОГИЧЕСКИЙ КОМПОНЕНТ В СИСТЕМЕ ПОДГОТОВКИ СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ

Современное белорусское общество, которое можно охарактеризовать как общество трансформирующееся, решает ряд комплексных проблем, охватывающих все сферы общественной жизни. Решение внутренних проблем совпадает с общемировыми, прежде всего с проблемой глобализации. Поэтому определяющее влияние оказывает стратегический выбор государства, народа. Он предполагает понимание целей развития и связан с кардинальными вопросами: к какому из вероятных сценариев будущего ведут современные реформы, во имя чего большинство граждан переживают сегодняшние трудности. Ответы на эти вопросы очерчивают контуры подходов, на которых может и должна сформироваться новая интегративная идеология. Государство и общество не могут развиваться без четких и понятных мировоззренческих ориентиров. К сожалению, с распадом СССР, образованием суверенных государств

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ